# ХРОНІКА

## БССР

### У БЕЛАРУСКАЙ АСОЦЫЯЦЫІ ПРОЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

● **Андрэй Александровіч** падрыхтаваў да друку I том твораў. У гэтым годзе споўніцца дзесяцігодзьдзе літаратурнай дзейнасьці. У ГІХЛ выходзіць кніга вершаў **Александровіча** ў расійскім перакладзе. У БДВ другім выданьнем выходзіць поэма „Цені на сонцы" і трэцім выданьнем зборнік вершаў „Угрунь".

● **Мікола Хведаровіч** працуе над поэмай „Іляэколгас". У поэме паказваецца хваля колектывізацыі 1930 г.

● **Міхась Лынькоў** працуе над аповесьцю „Бацькаўшчына". У выданьні ГІХЛ выходзіць зборнік апавяданьняў **Лынькова** ў расійскім перакладзе.

● **Янка Ліманоўскі** піша вялікі роман „Стапнее сьнег".

● **Алесь Звонак** выдае ў выдавецтве „Маладая Гвардыя" зборнік вершаў у расійскім перакладзе.

● Вышла асобнай кніжкай аповесьць **Янкі Скрыгана** „Затока ў бурах". Таксама вышаў яго зборнік нарысаў „Шугае сонца".

● **Сьцяпан Ліхадзіеўскі** здаў у БДВ кніжку колгаснай поэзіі „Крывавыя зьнічкі на сьнезе" (сэрыя „Мастацкае слова—масам").

● **Сяргей Знаёмы** працуе над другой часткай вялікага нарысу „Каця Астаповіч".

● У выданьні БДВ вышла пьеса **Уладзімера Стэльмаха** „Шляхі".

● **Уладзімер Сядура** працуе над вялікім артыкулам „Пытаньні сучаснай поэзіі". Адначасна піша артыкул пра творчасьць **Платона Галавача**.

### „УДАРНЫ ПОСТ"

● У БелАПП'е організавалася творчая брыгада „Ударны пост". У брыгаду ўвайшлі—Зьмітрок Астапенка, Платон Галавач, Аркадзь Куляшоў, Валеры Маракоў, Барыс Мікуліч, Юлі Таўбін, Станіслаў Шушкевіч.

Брыгадаю праведзены шэраг заняткаў, на якіх былі заслуханы творчыя справаздачы В. Маракова, Ю. Таўбіна, З. Астапенкі, А. Куляшова. У бліжэйшыя дні будуць заслуханы творчыя справаздачы іншых членаў „Ударнага посту".

Брыгада прымацавана да трох менскіх прадпрыемстваў („Комунар", „Эльвод" і Фармзавод).

Члены брыгады працуюць над наступнымі буйнымі рэчамі:

**В. Маракоў** здаў у друк аповесьць у прозе, працуе над поэмаю і здае ў БДВ зборнік выбраных вершаў.

**П. Галавач**—„Ён" (у романе падаецца тып падхаліма).

**Б. Мікуліч**—„Чорная Вірня" (аповесьць пра колектывізацыю і ўдзел у ёй 25-тысячнікаў).

**Ю. Таўбін**—„Таўрыда" (поэма пра перасяленьне яўрэяў на зямлю ў Крым).

**А. Куляшоў**—„Крыўда" (поэма пра імпэрыялістычную вайну).

**С. Шушкевіч**—здае ў друк кнігу вершаў „Паходні".

**З. Астапенка** і **Ю. Таўбін** пішуць аповесьць „Тры кругі".

● Да Дню Чырвонай арміі БелЛАЧАФ выдае літаратурна-мастацкі зборнік „13 год Чырвонай арміі" пад рэдакцыяй Бэндэ і Календы. У зборніку ўдзельнічаюць М. Чарот, В. Сташэўскі, П. Броўка, Я. Бобрык, С. Ліхадзіеўскі, П. Галавач, С. Шушкевіч і шэраг маладых пачынаючых чырвонаармейскіх пісьменьнікаў.

● **Ізі Харык** (яўрэйская сэкцыя БелАПП) канчае вялікую поэму „Бесьперапынка". Працуе над п'есай для яўрэйскага дзяржаўнага тэатру Беларусі. ГІХЛ выдае зборнік вершаў і поэм **Ізі Харыка** ў расійскім перакладзе.

● **Юдэльсон** канчае поэму „Комбінат". Падрыхтаваў да друку зборнік вершаў.

● Пры Менскай філіі БелАПП створана сэкцыя нарысу. У яе ўвайшлі нарысысты—белаппаўцы і газэтныя работнікі. Сэкцыя налічвае каля 34 чалавек.

● Пры Менскай філіі БелАПП організоўваецца сэкцыя крытыкі і сэкцыя драматургічная.

● У БелАПП па Менскай філіі залічаны т.т. Стэльмах (малады драматург), Сядура (малады крытык) і Вольскі (публіцысты).

● Сэкратарыятам БелАПП за нацыянал-дэмократычную дзейнасьць выключан з БелАПП Юрка Гаўрук.

● За адрыў ад работы БелАПП, за сыстэматычныя п'янкі выключаны з БелАПП'у Хадыка і Шалай.

● Вылучаны рабочы сэкратарыят БелАПП у які ўвайшлі: Ліманоўскі, Галавач, Барашка, Місьлінскі і Дунец.

● 1 сакавіка г.г. распачнецца пленум сэкратарыяту БелАПП. На парадку дню стаяць наступныя пытаньні: 1) політычны даклад (прадстаўнік ЦК КП(б)Б), 2) справаздача праўленьня БелАПП (Ліманоўскі), 3) аб творчай дыскусіі (Бронштэйн, Гальпэрына), 4) творчы твар БелАПП (Бэндэ, Аляхновіч, Дунец).